Д. С. Ясюкевіч

# К. К. РАКАСОЎСКІ – БАГРАЦІЁН САВЕЦКАЙ ЭПОХІ

*Разглядаюцца асноўныя вехі жыцця і дзейнасці Маршала СССР К.К. Ракасоўскага.*

Нарадзіўся Канстанцін Канстанцінавіч Ракасоўскі 21 снежня 1896 г. у Варшаве. Рана страціўшы бацьку, а хутка і маці, ён, так і не давучыўшыся, быў вымушаны з 15 гадоў працаваць рознарабочым. З пачаткам Першай сусветнай вайны К. Ракасоўскі паступіў добраахвотнікам у 5-ы Каргапальскі драгунскі полк 5-й кавалерыйскай дывізіі 12-й арміі. Праявіў храбрасць ў баях пад горадам Панявежам, за што быў прадстаўлены да Георгіеўскага крыжа 3-й ступені. Пазней быў ўзнагароджаны Георгіеўскай медаллю 4-й ступені. Пасля Грамадзянскай вайны К. Ракасоўскі закончыў Вышэйшыя кавалерыйскія камандныя курсы, а ў 1929 г. прайшоў курс удасканалення вышэйшага начальствуючага складу пры Акадэміі ім. М.В. Фрунзе. У 1935 г. у ходзе новаўводзін у Чырвонай Арміі К. Ракасоўскі атрымаў персанальнае зване камдзіва.

У жніўні 1937 г. К. Ракасоўскі па ілжываму даносу быў абвінавачаны ў сувязях з японскай і польскай разведкамі. Тры гады ён прабыў пад следствам ва ўнутранай турме НКУС. К.Ракасоўскі не стаў сябе агаворваць і 22 сакавіка 1940 г. быў вызвалены ў сувязі са спыненнем справы. Канстанціна Канстанцінавіча аднавілі ў грамадзянскіх правах, на ваеннай і партыйнай пасадах. Хутка яму прысвоілі званне генерал-маёра. Ужо 24 чэрвеня 1941 г. корпус К. Ракасоўскага прыняў першыя баі на луцкім напрамку і ў ваеннай гісторыі гэтыя дні запомніліся як дні адной з самых буйных танкавых бітваў. Многія байцы і камандзіры 9-га мехкорпуса атрымалі баявыя ўзнагароды, а сам К. Ракасоўскі – чацёрты па ліку ордэн Чырвонага Сцяга. Значны палкаводчаскі вопыт К. Ракасоўскі набыў у бітвах за Маскву. Нягледзячы на тое, што войскі 16-й арміі К.Ракасоўскага спачатку трапілі ў “Вяземскі кацёл”, яны здолелі выйсці з акружэння і стаялі на валакаламскім напрамку, выконваючы загад: “Ні кроку назад!” За бітву пад Масквой К.К. Ракасоўскі быў прадстаўлены да ўзнагароды ордэнам Леніна. У сакавіку 1942 г. К. Ракасоўскі быў цяжка паранены – асколак снарада закрануў пазваночнік, былі пашкоджаны лёгкія і печань. Талент арганізатара паспяховых, а часам і віртуозна арыгінальных у выкананні ваенных спецаперацый пазней пацвердзіўся ў дзеяннях К. Ракасоўскага ў ходзе аперацыі “Баграціён”, Усходне-Прускай і Усходне-Памеранскай, Берлінскай аперацыях. Таму зразумела, чаму яшчэ да аканчэння баёў у Беларусі К.К. Ракасоўскаму было прысвоена званне Маршала СССР. У верасні 1944 г. войскі 1-га Беларускага фронат выйшлі да Віслы. Чакалася, што 9 – 10 жніўня будзе ўзята Варшава, дзе 1 жніўня пачалося паўстанне. Але савецкім войскам удалося ўступіць у сталіцу Польшчы толькі 17 студзеня 1945 г., калі паўстанне ўжо было падаўлена, а сам горад быў разбураны амаль да фундаментаў. Савецкімі войскамі пад камандаваннем К.К. Ракасоўскага былі вызвалены і буйнейшыя порты і ваенна-марскія базы на Балтыцы – Гдыня і Гданьск (Данцыг). 31 сакавіка 1945 г. Маршал К.К. Ракасоўскі адным з першых сярод савецкіх военачальнікаў быў узнагароджаны ордэнам Перамогі. Пазней яму, як лепшаму з савецкіх камандуючых франтамі, было прадстаўлена права камандаваць Парадам Перамогі на Чырвонай Плошчы. У ваеннай гісторыі К.К. Ракасоўскі назаўсёды застанецца таленавітым палкаводцам, які не толькі стаў героем Вялікай Айчыннай вайны, але і праславіў савецкую зброю на ўвесь свет.

*Ясюкевич Дмитрий Сергеевич*, студент факультета информационных технологий и управления Белорусского государственного университета информатики и радиоэлекстроники, yasyukevich99@bk.ru
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна*, заведующий кафедрой гуманитарных дисциплин, кандидат исторических наук, доцент

Библиотека БГУИР